ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
29.07.2025 № 134

# Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для X–XI класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання

(павышаны ўзровень)

# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» (далей – вучэбная праграма) прызначана для вывучэння на павышаным узроўні вучэбнага прадмета «Беларуская мова» ў X–XI класах устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі.

2. Дадзеная вучэбная праграма разлічана на 102 гадзіны (3 гадзіны на тыдзень) у X класе; 102 гадзіны на год (3 гадзіны на тыдзень) – у XI класе.

3. Мэта навучання беларускай мове на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі (павышаны ўзровень) – не толькі падагульненне і сістэматызацыя, але і паглыбленне ведаў вучняў пра мову і маўленне ў параўнанні з базавым узроўнем, замацаванне і развіццё маўленчых уменняў і навыкаў, павышэнне матывацыі да працягу адукацыі па выбраным профілі, авалоданне некаторымі прафесійна арыентаванымі кампетэнцыямі.

4. Задачы навучання беларускай мове:

падагульніць і паглыбіць веды вучняў пра сістэму беларускай мовы на ўсіх яе ўзроўнях (фанетычным, лексічным, марфемным, марфалагічным і сінтаксічным); пашырыць веды пра стылістычныя магчымасці і тэкстаўтваральную функцыю моўных сродкаў; развіваць здольнасці аналізаваць і ацэньваць з прагматычнага і эстэтычнага пунктаў гледжання розныя моўныя з’явы;

сістэматызаваць і паглыбіць веды пра тэкст, тыпы, стылі і жанры маўлення; удасканаліць уменні і навыкі ў розных відах маўленчай дзейнасці, авалоданні культурай вуснага і пісьмовага маўлення;

развіваць уменні прымяняць атрыманыя веды пра камунікатыўныя якасці маўлення (правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, чысціню, багацце, выразнасць, дарэчнасць) для эфектыўнага ўзаемадзеяння ў маўленчай практыцы, у тым ліку ў прафесійна арыентаванай сферы зносін;

пашырыць і паглыбіць рытарычныя веды, якія забяспечваюць эфектыўныя зносіны ў любых маўленчых сітуацыях; садзейнічаць авалоданню прыёмамі эфектыўных маўленчых зносін, падрыхтоўкі і вядзення дыскусіі, палемікі; удасканаліць рытарычныя ўменні і навыкі ў розных відах маўленчай дзейнасці;

садзейнічаць усведамленню вучнямі нацыянальна-культурнай спецыфікі беларускай мовы, авалоданню нацыянальна маркіраванымі моўнымі адзінкамі, асэнсаванню ўзаемасувязі мовы і культуры на аснове выяўлення культурнага фону, які стаіць за нацыянальна маркіраванымі моўнымі адзінкамі;

пашырыць уяўленні вучняў пра ролю беларускай мовы ў жыцці чалавека і грамадства; дапамагчы авалодаць мовай як сродкам спасціжэння

нацыянальнай і сусветнай культуры, культурна-гістарычнага і сацыяльнага вопыту чалавецтва, засвоіць сацыяльныя нормы маўленчых паводзін у розных сітуацыях зносін, выхоўваць каштоўнасныя адносіны да беларускай мовы і культуры, павагу да культурных каштоўнасцей народаў свету.

5. Рэкамендаваныя формы навучання і выхавання: лекцыі, лекцыі-гутаркі, семінарскія заняткі, практыкумы, сюжэтна-тэматычныя ўрокі; метады і прыёмы, накіраваныя на развіццё творчых здольнасцей вучняў: лінгвістычны эксперымент, самастойная работа па аналізе тэкстаў, падрыхтоўка рэфератаў, паведамленняў, дакладаў, творчыя работы ў жанры эсэ, нарыса, апавядання і іншыя.

Выбар форм і метадаў навучання і выхавання вызначаецца педагагічным работнікам самастойна на аснове мэт і задач вывучэння пэўнай тэмы, сфармуляваных у вучэбнай праграме патрабаванняў да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў з улікам іх узроставых і індывідуальных асаблівасцей.

Прыярытэтнай задачай профільнага навучання становіцца фарміраванне культуры вуснага і пісьмовага маўлення вучняў, таму засваенне і асэнсаванне ўсіх моўных адзінак на III ступені навучання адбываецца ў аспекце культуры маўлення, што і перадаюць назвы раздзелаў вучэбнай праграмы: «Фанетыка і арфаэпія. Графіка і арфаграфія. Культура маўлення», «Лексіка. Фразеалогія. Культура маўлення», «Марфемная будова слова. Словаўтварэнне. Культура маўлення», «Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення», «Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення». З гэтай мэтай паглыбляюцца веды вучняў пра нормы беларускай мовы (арфаэпічныя, акцэнталагічныя, лексічныя, фразеалагічныя, словаўтваральныя, граматычныя, арфаграфічныя, пунктуацыйныя, стылістычныя), сродкі і прыёмы маўленчай выразнасці, стылістычную ролю і тэкстаўтваральныя магчымасці моўных сродкаў, удасканальваюцца ўменні аналізаваць і ацэньваць чужыя і рэдагаваць уласныя выказванні.

Прыкладныя віды дзейнасці, якія мэтазгодна выкарыстоўваць на вучэбных занятках па беларускай мове:

чытанне (азнаямляльнае, выбарачнае, пошукавае, вывучальнае) тэкстаў на лінгвістычную тэму;

аналіз тэкстаў розных стыляў маўлення, абгрунтаванне мэтазгоднасці выкарыстання ў іх пэўных моўных сродкаў;

напісанне тэзісаў і канспектаў лекцый, дакладаў, навуковых, навукова-папулярных і публіцыстычных артыкулаў;

напісанне розных відаў навучальных і кантрольных работ (дыктанты, пераказы, пераклады, анатацыі, водгукі, рэцэнзіі, тэсты і іншыя віды работ);

напісанне самастойных тэкстаў пэўнага стылю і жанру, тэкстаў на адну тэму ў розных стылях маўлення;

рэдагаванне тэкстаў розных стыляў, знаходжанне і выпраўленне маўленчых недахопаў, арфаграфічных, пунктуацыйных і граматычных памылак;

слуханне і аналіз публіцыстычных, навуковых выступленняў (ці іх фрагментаў);

публічнае выступленне на пэўную тэму перад аўдыторыяй; удзел у дыспутах, дыскусіях;

напісанне рэферата, работ даследчага характару лінгвістычнай тэматыкі.

6. У працэсе вывучэння беларускай мовы прадугледжана дасягненне вучнямі прадметных, метапрадметных і асобасных адукацыйных вынікаў.

Да прадметных вынікаў вучэбнага прадмета «Беларуская мова» адносяцца моўная, маўленчая, камунікатыўная, рытарычная, лінгвакультуралагічная і сацыякультурная кампетэнцыі.

Моўная кампетэнцыя – валоданне сістэмай мовы на ўсіх яе ўзроўнях (фанетычным, лексічным, марфемным, марфалагічным і сінтаксічным), заканамернасцямі і правіламі функцыянавання моўных сродкаў у маўленні, нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

Маўленчая кампетэнцыя – валоданне спосабамі перадачы думкі сродкамі мовы ў вуснай і пісьмовай формах, у розных відах маўленчай дзейнасці, правіламі адбору моўных сродкаў з улікам сферы зносін.

Камунікатыўная кампетэнцыя – валоданне культурай маўлення, правіламі маўленчых зносін, уменнямі ствараць самастойныя вусныя і пісьмовыя выказванні розных тыпаў, стыляў і жанраў.

Рытарычная кампетэнцыя – валоданне рознымі відамі публічных выступленняў, адпаведнымі рытарычнымі прыёмамі і сродкамі, якія забяспечваюць эфектыўныя зносіны.

Лінгвакультуралагічная кампетэнцыя – усведамленне вучнямі мовы як феномена культуры, у якім знайшлі адбітак яе праяўленні, засваенне нацыянальна маркіраваных адзінак беларускай мовы, развіццё здольнасці адэкватна ўжываць іх у маўленні, авалоданне мовай як сістэмай захавання і перадачы каштоўнасцей культуры.

Сацыякультурная кампетэнцыя – засваенне сацыяльных норм маўленчых паводзін, культурных каштоўнасцей беларускага народа і агульначалавечых каштоўнасцей, ідэалаў, традыцый, звычаяў, якія рэгулююць узаемадзеянне і паводзіны людзей у грамадстве, фарміраванне здольнасці карыстацца культуразнаўчымі звесткамі ў працэсе маўленчых зносін, развіццё сродкамі мовы інтэлектуальнай, камунікатыўнай, духоўна-маральнай, грамадзянскай культуры вучняў.

Метапрадметныя вынікі асваення зместу вучэбнага прадмета «Беларуская мова» заключаюцца ў гатоўнасці вучня да вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, засваенні ўніверсальных вучэбных дзеянняў і

міжпрадметных паняццяў, у тым ліку:

ажыццяўленне прыёмаў разумовай дзейнасці на адпаведным узроставым асаблівасцям узроўні: уменне аналізаваць і сінтэзаваць, аперыраваць паняццямі, рабіць абагульненні, устанаўліваць аналогіі і прычынна-выніковыя сувязі, класіфікаваць, рабіць вывады і падагульненні;

здольнасць пісьменна і аргументавана выкладаць свае думкі ў вуснай і пісьмовай формах; адстойваць і абгрунтоўваць свой пункт гледжання;

уменне свядома выкарыстоўваць маўленчыя сродкі для ажыццяўлення камунікацыі; наяўнасць сфарміраваных навыкаў усвядомленага чытання тэкстаў розных стыляў і жанраў;

уменне выкарыстоўваць розныя крыніцы інфармацыі з вучэбна-пазнавальнымі мэтамі, працаваць з тэкставай і графічнай інфармацыяй, вылучаць галоўнае; рацыянальна і бяспечна выкарыстоўваць інфармацыйныя камунікацыйныя тэхналогіі пры рашэнні рознага роду задач; крытычна ацэньваць і інтэрпрэтаваць інфармацыю, якая змяшчаецца ў розных крыніцах;

праяўленне цікавасці да вучэбна-даследчай і праектнай дзейнасці, здольнасць і гатоўнасць да самастойнай творчай дзейнасці.

Да асобасных адукацыйных вынікаў належаць: валоданне беларускай мовай як сродкам пазнання свету, далучэння да культуры як сістэмы каштоўнасцей і норм паводзін; валоданне пачуццём патрыятызму, грамадзянскасці, захаванне нацыянальнай ідэнтычнасці ў полікультурным соцыуме; дэманстрацыя ўстойлівай цікавасці да самастойнай дзейнасці, самапазнання, самаразвіцця; здольнасць да супрацоўніцтва і камунікацыі ў розных сітуацыях і ўмовах маўленчых зносін.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

### X клас
(102 гадзіны на год, 3 гадзіны на тыдзень, з іх 19 гадзін – на кантрольныя і навучальныя пісьмовыя работы; 1 гадзіна рэзервовая)

### Роля мовы ў жыцці чалавека і грамадства
(1 гадзіна)

Мова як грамадская з’ява. Функцыі мовы.

Віды дзейнасці: чытанне тэкстаў, вызначэнне на іх аснове ролі мовы ў жыцці чалавека і грамадства, функцый мовы; выяўленне фактараў, якія выклікаюць змены ў грамадстве; чытанне вершаваных твораў пра ролю мовы; стварэнне ўласных выказванняў пра мову як грамадскую з’яву.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Мець уяўленне:

пра мову як грамадскую з’яву, функцыі мовы і ролю мовы ў жыцці чалавека і грамадства.

Умець:

вызначаць функцыі мовы, ствараць уласныя выказванні пра мову як грамадскую з’яву.

Валодаць:

нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы ва ўласным вусным і пісьмовым маўленні.

Маўленне
(5 гадзін, з іх 2 гадзіны – на навучальную пісьмовую работу)

Маўленне як працэс маўленчых зносін. Маўленчая сітуацыя і яе кампаненты.

Віды маўленчай дзейнасці: гаварэнне, слуханне, чытанне і пісьмо. Формы маўленчай камунікацыі: вусная і пісьмовая, дыялагічная і маналагічная.

Жанры дыялагічнага маўлення: дыскусія і палеміка.

Навучальнае сачыненне-разважанне на дыскусійную тэму.

Віды дзейнасці: чытанне тэкстаў на лінгвістычную тэму, выяўленне адрозненняў паміж мовай і маўленнем; вусныя паведамленні з апорай на схему; падрыхтоўка паведамленняў на аснове прапанаваных сітуацый; раскрыццё сэнсу прыказак пра мову і маўленне; параўнанне вуснага і пісьмовага маўлення на аснове табліцы; вызначэнне асаблівасцей вуснага і пісьмовага маўлення; удзел у дыскусіі (палеміцы); стварэнне тэкстаў-разважанняў на дыскусійныя тэмы.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

кампаненты маўленчай сітуацыі, віды маўленчай дзейнасці (чытанне, слуханне, гаварэнне, пісьмо) і формы маўленчай камунікацыі (вусная і пісьмовая, дыялагічная і маналагічная).

Умець:

даваць характарыстыку маўленчай сітуацыі; размяжоўваць вуснае і пісьмовае, маналагічнае і дыялагічнае маўленне; адэкватна ўспрымаць вуснае і пісьмовае маўленне, валодаць навыкамі чытання тэкстаў розных стыляў услых і самому сабе, весці дыялог у сітуацыі афіцыйных і

неафіцыйных маўленчых зносін; ствараць тэксты-разважанні на дыскусійную тэму.

Валодаць:

нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы ва ўласным вусным і пісьмовым маўленні.

Тэкст
(4 гадзіны)

Тэкст, прыметы тэксту: сэнсавая цэласнасць і тэматычнае адзінства, разгорнутасць, паслядоўнасць, звязнасць, завершанасць тэксту (паўтарэнне і сістэматызацыя вывучанага).

Функцыянальна-сэнсавыя тыпы маўлення: апісанне, апавяданне, разважанне. Функцыянаванне моўных сродкаў у тэкстах розных тыпаў і стыляў.

Комплексны аналіз тэксту.

Віды дзейнасці: устанаўленне адпаведнасці паміж прыметамі тэксту і іх характарыстыкамі; вызначэнне асноўных прымет тэкстаў; стварэнне тэкстаў з прапанаваных сказаў; чытанне тэкстаў, абгрунтаванне іх прыналежнасці да пэўнага тыпу маўлення; складанне тэкстаў з апорай на схему, па прапанаваных малюнках; комплексны аналіз тэксту.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

прыметы тэксту, спосабы і сродкі сувязі сказаў у тэксце; асноўныя характарыстыкі тыпаў маўлення.

Умець:

вызначаць адрасата і мэтанакіраванасць тэксту; выяўляць прыметы тэксту, вызначаць яго тэму і асноўную думку, даваць загаловак, дзяліць тэкст на часткі (падтэмы і мікратэмы) і абзацы; вызначаць спосаб і сродкі сувязі сказаў і частак у тэксце, выдзяляць апорныя (ключавыя) словы, словазлучэнні, сказы; аналізаваць тэксты розных тыпаў маўлення, складаць іх схемы; рабіць комплексны аналіз тэксту; складаць уласныя выказванні розных функцыянальна-сэнсавых тыпаў маўлення.

Валодаць:

нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы пры стварэнні тэкстаў розных тыпаў маўлення (апавяданне, апісанне, разважанне).

Культура маўлення
(5 гадзін)

Асноўныя якасці культуры маўлення: правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, чысціня, дарэчнасць, багацце і выразнасць маўлення.

Сродкі і прыёмы выразнасці маўлення на розных моўных узроўнях: лексічным, фанетычным, словаўтваральным, марфалагічным, сінтаксічным. Маўленчыя памылкі і спосабы іх выпраўлення.

Камунікатыўная сітуацыя і правілы маўленчых паводзін. Маўленчы этыкет і беларускія нацыянальна-культурныя этыкетныя традыцыі.

Віды дзейнасці: чытанне навуковых тэкстаў, выказванняў вучоных пра культуру маўлення; вызначэнне графічных сродкаў выразнасці на фанетычным, словаўтваральным, лексічным, граматычным узроўнях; знаходжанне і выпраўленне маўленчых памылак у сказах з вучнёўскіх сачыненняў; падрыхтоўка выказванняў пра маўленчы этыкет на аснове тэксту; тэзісная перадача тэксту; падрыхтоўка тэксту віншавальнай паштоўкі.

## Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

асноўныя камунікатыўныя якасці маўлення; правілы маўленчых паводзін у пэўных сітуацыях маўлення, формулы маўленчага этыкету.

Умець:

ужываць згодна з маўленчай сітуацыяй і зместам камунікацыі моўныя сродкі для наладжвання неканфліктных, добразычлівых і паспяховых узаемаадносін; захоўваць і ўдасканальваць культуру маўленчых паводзін; дарэчы карыстацца нацыянальным маўленчым этыкетам.

Валодаць:

нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы пры стварэнні самастойных вусных і пісьмовых выказванняў.

## Фанетыка і арфаэпія. Графіка і арфаграфія. Культура маўлення (22 гадзіны, з іх 3 гадзіны – на кантрольныя і навучальную пісьмовыя работы)

Гукі і літары беларускай мовы (паўтарэнне і сістэматызацыя вывучанага). Моцная і слабая пазіцыя галосных і зычных гукаў. Пазіцыйныя і гістарычныя чаргаванні гукаў.

Арфаэпічныя нормы: вымаўленне галосных і зычных гукаў, некаторых спалучэнняў зычных. Акцэнталагічныя нормы. Памылкі, выкліканыя парушэннем арфаграфічных і акцэнталагічных норм.

Вобразна-выяўленчыя магчымасці фанетыкі беларускай мовы (гукапіс, асананс, алітарацыя).

Прынцыпы беларускай арфаграфіі. Арфаграфічныя нормы: напісанні,

заснаваныя на фанетычным прынцыпе; напісанні, заснаваныя на марфалагічным прынцыпе; правапіс мяккага знака і апострафа, вялікай і малой літар; правілы напісання слоў разам, праз злучок і асобна. Памылкі, выкліканыя парушэннем арфаграфічных норм.

Навучальная тэставая работа.

Кантрольны дыктант.

Кантрольная тэставая работа.

Віды дзейнасці: чытанне тэкстаў з захаваннем правіл літаратурнага вымаўлення; фанетычны запіс слоў; вуснае паведамленне на аснове табліцы; рэдагаванне парушэнняў арфаэпічных норм; аналіз тэкстаў на лінгвістычную тэму; пастаноўка націску ў прапанаваных словах; выпраўленне няправільнай пастаноўкі націску ў словах; праца са слоўнікам; запіс слоў, сказаў, тэкстаў у адпаведнасці з пэўнымі правіламі правапісу, абгрунтаванне напісанняў; падбор і запіс беларускіх адпаведнікаў да слоў, словазлучэнняў рускай мовы; пераклад сказаў, тэкстаў з рускай мовы на беларускую, выяўленне адрозненняў у правапісе; выбарачныя, тлумачальныя, размеркавальныя дыктанты; запіс сказаў, тэкстаў з устаўленнем прапушчаных літар; выпраўленне вымаўленчых і правапісных парушэнняў норм беларускай літаратурнай мовы ў чужым і ўласным маўленні; выкананне тэставых работ.

### Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

арфаэпічныя, акцэнталагічныя і арфаграфічныя нормы сучаснай беларускай мовы.

Умець:

знаходзіць і выпраўляць вымаўленчыя і правапісныя парушэнні норм беларускай літаратурнай мовы ў чужым і ўласным маўленні, устанаўліваць прычыны парушэння норм; захоўваць арфаэпічныя, акцэнталагічныя, арфаграфічныя нормы сучаснай беларускай мовы ў маўленні; дарэчы ўжываць вобразна-выяўленчыя моўныя сродкі; выконваць тэставыя работы.

Валодаць:

арфаэпічнымі, акцэнталагічнымі, арфаграфічнымі нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы ва ўласным вусным і пісьмовым маўленні.

### Лексіка. Фразеалогія. Культура маўлення
### (15 гадзін, з іх 4 гадзіны – на кантрольныя пісьмовыя работы)

Лексічнае і граматычнае значэнне слова. Прамое і пераноснае значэнне слова. Шляхі ўзнікнення і тыпы пераноснага значэння.

Сінонімы, іх роля ў маўленні. Сінанімічны рад. Слоўнікі сінонімаў. Выкарыстанне сінонімаў як сродку выразнасці ў тэкстах мастацкага стылю.

Антонімы, іх роля ў маўленні. Вобразна-выяўленчыя магчымасці антонімаў. Слоўнікі антонімаў.

Амонімы. Спосабы размежавання мнагазначных слоў і амонімаў. Міжмоўныя амонімы. Вобразна-выяўленчыя магчымасці амонімаў. Слоўнікі амонімаў.

Паронімы. Паронімы і дакладнасць маўлення. Слоўнікі паронімаў.

Лексіка беларускай мовы паводле паходжання.

Лексіка беларускай мовы паводле ўжывання. Актыўная і пасіўная лексіка.

Лексіка беларускай мовы паводле стылістычнай афарбоўкі.

Лексічны разбор.

Фразеалагізмы, іх роля ў маўленні. Размежаванне фразеалагізмаў і свабодных словазлучэнняў. Выкарыстанне фразеалагізмаў як сродку выразнасці ў тэкстах мастацкага стылю. Слоўнікі фразеалагізмаў беларускай мовы.

Лексічныя і фразеалагічныя нормы: ужыванне слова ў адпаведнасці з яго лексічным значэннем, адрозненне мнагазначных слоў і амонімаў, правільнае ўжыванне сінонімаў, антонімаў, паронімаў, фразеалагізмаў. Памылкі, выкліканыя парушэннем маўленчых (лексічных, фразеалагічных) норм.

Кантрольнае сачыненне-разважанне на маральна-этычную тэму (на аснове прыказкі).

Кантрольны падрабязны пераказ тэксту.

Віды дзейнасці: запіс слоў у адпаведнасці з прапанаванымі значэннямі; тлумачэнне значэння слоў; вызначэнне мнагазначных слоў, слоў у прамым і пераносным значэнні; падбор сінонімаў, антонімаў; раскрыццё значэння слоў з дапамогай кантэксту; тлумачэнне значэння паронімаў; вуснае паведамленне пра лексіка-семантычныя катэгорыі слоў; знаходжанне і выпраўленне памылак ва ўжыванні слоў; стварэнне тэкстаў-разважанняў (на аснове прыказкі); праца з тлумачальным слоўнікам, слоўнікамі сінонімаў, антонімаў, амонімаў, паронімаў, фразеалагізмаў; падрабязны пераказ тэксту; вусныя сачыненні-разважанні на аснове прыказкі.

### Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

сутнасныя характарыстыкі адназначных і мнагазначных слоў, прамога і пераноснага значэнняў слова, сінонімаў, антонімаў, амонімаў, паронімаў; ведаць і захоўваць лексічныя нормы ў вусным і пісьмовым маўленні.

Умець:

вызначаць лексічнае значэнне слоў; размяжоўваць прамое і пераноснае значэнні слоў; адрозніваць мнагазначныя словы і амонімы; падбіраць да слоў сінонімы, антонімы; правільна ўжываць паронімы; выяўляць у сказах, тэкстах фразеалагізмы, разумець іх значэнні, вызначаць сэнсава-стылістычную і сінтаксічную ролю; знаходзіць і выпраўляць лексічныя недахопы ў чужым і ўласным маўленні, устанаўліваць прычыны парушэння норм; карыстацца стылістычнымі магчымасцямі лексікі і фразеалогіі з мэтай выразнасці і дакладнасці маўлення; правільна ўжываць фразеалагізмы ў пэўным кантэксце; рабіць падрабязны пераказ тэксту; ствараць сачыненні-разважанні на маральна-этычную тэму (на аснове прыказкі).

Валодаць:

лексічнымі нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы пры стварэнні ўласных вусных і пісьмовых выказванняў.

### Марфемная будова слова. Словаўтварэнне і арфаграфія. Культура маўлення
(10 гадзін, з іх 2 гадзіны – на навучальную пісьмовую работу)

Марфема як значымая частка слова. Словаўтваральныя і формаўтваральныя марфемы. Вытворная і невытворная асновы. Утваральная аснова. Марфемы-сінонімы, марфемы-антонімы, марфемы-амонімы, іх стылістычныя асаблівасці. Разбор слова па саставе. Марфемныя слоўнікі.

Правапіс і, ы, й пасля прыставак. Правапіс прыставак, якія заканчваюцца на зычны. Правапіс складаных і складанаскарочаных слоў.

Спосабы ўтварэння слоў. Словаўтваральны разбор. Словаўтваральныя нормы. Памылкі, выкліканыя парушэннем словаўтваральных норм. Словаўтваральныя слоўнікі.

Стылістычныя магчымасці словаўтварэння. Аднакаранёвыя словы як сродак тэматычнага адзінства тэксту.

Навучальнае сачыненне-апісанне па карціне.

Віды дзейнасці: вусныя выказванні на лінгвістычную тэму з апорай на табліцы, схемы; складанне схем пра спосабы ўтварэння слоў у сучаснай беларускай мове; утварэнне слоў з дапамогай прапанаваных словаўтваральных сродкаў; практыкаванні на правапіс прыставак, правапіс складаных і складанаскарочаных слоў; знаходжанне і выпраўленне памылак ва ўтварэнні слоў; праца з марфемным і словаўтваральным слоўнікамі; стварэнне тэкстаў-апісанняў па карціне.

### Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

марфемную будову слова; віды асноў; спосабы ўтварэння слоў.

Умець:

вызначаць у словах марфемы; размяжоўваць вытворныя і невытворныя словы; адрозніваць спосабы ўтварэння слоў; выкарыстоўваць аднакаранёвыя словы як сродак тэматычнага адзінства тэксту; ствараць тэксты-апісанні па карціне.

Валодаць:

словаўтваральнымі нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы пры стварэнні ўласных вусных і пісьмовых выказванняў.

Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення
(37 гадзін, з іх 8 гадзін – на кантрольныя і навучальныя пісьмовыя работы)

Сістэма часцін мовы.

Назоўнік: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Лексіка-граматычныя разрады назоўнікаў. Катэгорыя адушаўлёнасці-неадушаўлёнасці назоўнікаў. Катэгорыя роду і ліку назоўнікаў. Скланенне назоўнікаў, правапіс склонавых канчаткаў. Марфалагічны разбор назоўніка. Сэнсава-стылістычная і тэкстаўтваральная роля назоўнікаў у тэкстах розных тыпаў і стыляў маўлення.

Марфалагічныя нормы: вызначэнне роду нескланяльных запазычаных назоўнікаў і абрэвіятур, неадушаўлёных складаных назоўнікаў; ужыванне нескланяльных назоўнікаў.

Прыметнік: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Разрады прыметнікаў паводле значэння. Утварэнне ступеней параўнання якасных прыметнікаў. Утварэнне і скланенне прыметнікаў. Правапіс склонавых канчаткаў і суфіксаў прыметнікаў. Марфалагічны разбор прыметніка. Сэнсава-стылістычная і тэкстаўтваральная роля прыметнікаў у тэкстах розных тыпаў і стыляў маўлення.

Марфалагічныя нормы: ужыванне поўных і кароткіх прыметнікаў, форм ступеней параўнання якасных прыметнікаў, ужыванне прыналежных прыметнікаў.

Лічэбнік: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Разрады лічэбнікаў паводле будовы, значэння і граматычных прымет. Сінтаксічная сувязь лічэбнікаў з назоўнікамі. Скланенне і правапіс лічэбнікаў. Марфалагічны разбор лічэбніка. Сэнсава-стылістычная і тэкстаўтваральная роля лічэбнікаў у тэкстах розных тыпаў і стыляў маўлення.

Марфалагічныя нормы: ужыванне колькасных і парадкавых лічэбнікаў, спалучальнасць зборных лічэбнікаў з назоўнікамі і займеннікамі.

Займеннік: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Разрады займеннікаў. Утварэнне і правапіс займеннікаў. Марфалагічны разбор займенніка. Сэнсава-стылістычная і тэкстаўтваральная роля займеннікаў у тэкстах розных тыпаў і стыляў маўлення.

Марфалагічныя нормы: ужыванне асабовых займеннікаў, ужыванне прыназоўніка пры адмоўным займенніку, акцэнталагічныя нормы пры скланенні займеннікаў сам, сама, самы, ніхто, нішто.

Дзеяслоў: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Формы дзеяслова. Правапіс дзеясловаў. Марфалагічны разбор дзеяслова.

Дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе як асобыя формы дзеяслова. Марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля дзеепрыметніка. Утварэнне і правапіс дзеепрыметнікаў. Марфалагічны разбор дзеепрыметніка. Марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля дзеепрыслоўя. Утварэнне і правапіс дзеепрыслоўяў. Марфалагічны разбор дзеепрыслоўя. Сэнсава-стылістычная і тэкстаўтваральная роля дзеяслова і яго форм у тэкстах розных тыпаў і стыляў маўлення.

Марфалагічныя нормы: ужыванне асабовых канчаткаў дзеясловаў, адрозненне канчаткаў дзеясловаў абвеснага і загаднага ладу, ужыванне дзеясловаў з суфіксамі -ава- (-ява-) і -ірава- (-ырава-), акцэнталагічныя нормы пры ўтварэнні спрагальных форм дзеясловаў; ужыванне дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў, дзеепрыметнікавых і дзеепрыслоўных зваротаў.

Прыслоўе: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Разрады прыслоўяў па значэнні. Утварэнне форм ступеней параўнання якасных прыслоўяў. Утварэнне і правапіс прыслоўяў. Марфалагічны разбор прыслоўя. Сэнсава-стылістычная і тэкстаўтваральная роля прыслоўяў у тэкстах розных тыпаў і стыляў маўлення.

Марфалагічныя нормы: адрозненне вышэйшай ступені параўнання прыслоўя ад вышэйшай ступені параўнання прыметніка.

Прыназоўнік, злучнік, часціца як службовыя часціны мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Выклічнік і гукаперайманне. Правапіс прыназоўнікаў, злучнікаў, часціц, выклічнікаў і гукаперайманняў. Ужыванне часціц не і ні. Правапіс не (ня), ні з рознымі часцінамі мовы. Сінаніміка службовых часцін мовы. Сэнсава-стылістычная і тэкстаўтваральная роля службовых часцін мовы ў тэкстах розных тыпаў і стыляў маўлення.

Марфалагічныя нормы: ужыванне прыназоўнікаў у словазлучэннях, якія перадаюць асаблівасці кіравання ў беларускай мове.

Памылкі, выкліканыя парушэннем марфалагічных норм.

Навучальная тэставая работа.

Кантрольнае сачыненне-разважанне на маральна-этычную тэму.

Навучальнае сачыненне-апавяданне з апісаннем родных мясцін.

Кантрольнае сачыненне-разважанне на грамадзянска-патрыятычную тэму (пра вядомага земляка або іншых знакамітых асоб).

Кантрольная тэставая работа.

Віды дзейнасці: вусныя паведамленні пра часціны мовы (з апорай або без апоры на табліцы, схемы); складанне самастойных табліц, схем; аналіз несупадзення ліку і роду назоўнікаў, ступеняў параўнання прыметнікаў і прыслоўяў, вымаўлення і правапісу лічэбнікаў і займеннікаў у беларускай і рускай мовах; пераклад слоў, словазлучэнняў, сказаў, тэкстаў з рускай мовы на беларускую, выяўленне адрозненняў; слоўнікавыя, тлумачальныя, выбарачныя, размеркавальныя дыктанты; запіс сказаў, тэкстаў з устаўленнем прапушчаных літар; знаходжанне і выпраўленне памылак ва ўтварэнні ці напісанні слоў розных часцін мовы; стварэнне самастойных тэкстаў-апавяданняў з элементамі апісання, тэкстаў-разважанняў; выкананне тэставых работ.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

марфалагічныя прыметы пэўнай часціны мовы і сінтаксічную ролю ў сказе, ролю розных часцін мовы ў арганізацыі маўлення, разгортванні і стварэнні тэкстаў розных тыпаў, стыляў і жанраў маўлення.

Умець:

распазнаваць часціны мовы і іх формы ў сказах, тэкстах на аснове іх сэнсавых, граматычных і сінтаксічных прымет; рабіць марфалагічны разбор часцін мовы; выяўляць пэўныя моўныя адзінкі ў тэкстах, вызначаць асаблівасці іх ўжывання ў тэкстах розных тыпаў, стыляў і жанраў маўлення; мэтанакіравана і свядома ўжываць у вусным і пісьмовым маўленні моўныя адзінкі з улікам пэўнай камунікатыўнай задачы; ствараць самастойныя тэксты рознай жанрава-стылістычнай прыналежнасці з улікам сэнсава-стылістычнай ролі і тэкстаўтваральных магчымасцей слоў розных часцін мовы; ствараць тэксты-разважанні на лінгвістычную, маральна-этычную і грамадзянска-патрыятычную тэмы, тэксты-апавяданні з апісаннем родных мясцін.

Валодаць:

марфалагічнымі нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы пры стварэнні ўласных вусных і пісьмовых выказванняў.

Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага
(2 гадзіны)

Моўныя нормы і культура маўлення. Памылкі, выкліканыя парушэннем моўных норм.

Віды дзейнасці: вусныя паведамленні на лінгвістычную тэму (пра часціны мовы); дапаўненне табліцы пра нормы літаратурнай мовы; вусныя выказванні пра моўныя нормы; запіс прыкладаў з захаваннем моўных норм літаратурнай мовы (арфаэпічных, акцэнталагічных, лексічных, фразеалагічных, словаўтваральных, марфалагічных, арфаграфічных і пунктуацыйных); падбор слоў для арфаграфічнага дыктанта; знаходжанне і выпраўленне моўных памылак; тлумачэнне памылак, выкліканых парушэннем моўных норм; пераклад сказаў (тэкстаў) з рускай мовы на беларускую, выяўленне сэнсава-граматычных і стылістычных адрозненняў; стварэнне ўласных выказванняў (у тым ліку на лінгвістычную тэму) з захаваннем моўных норм і асноўных якасцей культуры маўлення.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

асноўныя арфаэпічныя, акцэнталагічныя, лексічныя, фразеалагічныя, словаўтваральныя, марфалагічныя нормы сучаснай беларускай мовы.

Умець:

выконваць розныя віды моўных разбораў; выкарыстоўваць у вусным і пісьмовым маўленні моўныя адзінкі з улікам камунікатыўнай задачы і культуры маўлення; запісваць сказы (тэксты) з захаваннем моўных норм; знаходзіць і выпраўляць памылкі; тлумачыць памылкі, выкліканыя парушэннем моўных норм; перакладаць сказы (тэксты) з рускай мовы на беларускую, выяўляць сэнсава-граматычныя і стылістычныя адрозненні; ствараць уласныя выказванні (у тым ліку на лінгвістычную тэму) з захаваннем моўных норм.

Валодаць:

асноўнымі арфаэпічнымі, акцэнталагічнымі, лексічнымі, фразеалагічнымі, словаўтваральнымі, марфалагічнымі нормамі сучаснай беларускай мовы і культурай маўлення пры стварэнні ўласных выказванняў у вуснай і пісьмовай форме.

## XI клас

(102 гадзіны на год, 3 гадзіны на тыдзень, з іх 19 гадзін – на кантрольныя і навучальныя пісьмовыя работы; 3 гадзіны рэзервовыя)

### Агульныя звесткі пра мову
(1 гадзіна)

Мова і маўленне. Веданне мовы і валоданне мовай.

Віды дзейнасці: чытанне тэкстаў, выяўленне адрозненняў паміж мовай і маўленнем; вусныя паведамленні; спісванне сказаў, тэкстаў; запіс і тлумачэнне выказванняў пра мову; складанне словазлучэнняў са словамі мова, маўленне; пераклад тэкстаў з рускай мовы на беларускую, знаходжанне і выпраўленне памылак у чужым і ўласным вусным і пісьмовым маўленні.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

адрозненне паняццяў «мова» і «маўленне»; віды маўленчай дзейнасці (чытанне, слуханне, гаварэнне, пісьмо); формы маўленчай камунікацыі (вуснае і пісьмовае, дыялагічнае і маналагічнае маўленне); значэнне валодання мовай для паспяховай сацыялізацыі і самарэалізацыі.

Умець:

адэкватна ўспрымаць вуснае і пісьмовае маўленне; аналізаваць прачытаныя і праслуханыя тэксты, ствараць на іх аснове ўласныя вусныя і пісьмовыя выказванні.

Валодаць:

нормамі сучаснай беларускай мовы ва ўласным вусным і пісьмовым маўленні.

Стылістыка
(5 гадзін, з іх 1 гадзіна – на навучальную пісьмовую работу)

Функцыянальныя стылі (навуковы, афіцыйны, публіцыстычны, мастацкі, гутарковы) і жанры маўлення, стылеўтваральныя моўныя сродкі.

Стылістычны аналіз тэксту. Стылістычныя нормы. Памылкі, выкліканыя парушэннем стылістычных норм.

Навучальная тэставая работа.

Віды дзейнасці: паведамленне пра функцыянальныя стылі маўлення на аснове схемы; вызначэнне стыляў па іх прыметах, прыведзеных у табліцы; чытанне тэкстаў, вызначэнне іх стылю, тыпу, жанру, вызначэнне рыс стыляў; паведамленне на аснове тэксту аб стылеўтваральных магчымасцях моўных адзінак у тэкстах навуковага стылю; устанаўленне адпаведнасці паміж стылямі і прыметамі стыляў; вызначэнне стыляў, у якіх ужываюцца пэўныя словы і выразы; падбор сінанімічных слоў і выразаў з нейтральнай стылістычнай афарбоўкай да прыведзеных канцылярызмаў і штампаў; чытанне тэкстаў, узораў іх стылістычнага аналізу; стылістычны аналіз тэкстаў; выяўленне і выпраўленне стылістычных памылак; падрыхтоўка тэкстаў паведамленняў рознай жанрава-стылістычнай прыналежнасці;

выкананне тэставай работы.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

асноўныя прыметы, па якіх характарызуецца кожны стыль (у тым ліку асаблівасці ўжывання моўных сродкаў у тэкстах розных стыляў і жанраў).

Умець:

распазнаваць тэксты розных стыляў маўлення; абгрунтоўваць прыналежнасць тэкстаў да пэўнага стылю; выяўляць асаблівасці ўжывання моўных сродкаў у тэкстах розных стыляў і жанраў; удасканальваць тэксты рознай стылістычнай прыналежнасці з мэтай захавання стылявога адзінства; ствараць самастойныя тэксты рознай жанрава-стылістычнай прыналежнасці; выконваць тэставыя работы.

Валодаць:

нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы пры стварэнні тэкстаў рознай жанрава-стылістычнай прыналежнасці.

Маўленчыя зносіны
(3 гадзіны)

Умовы і правілы маўленчых паводзін. Правілы і асноўныя сродкі арганізацыі эфектыўных маўленчых зносін. Маўленчы этыкет.

Вуснае маналагічнае маўленне. Структура маналагічнага маўлення, стылістычныя асаблівасці і сродкі маўленчай выразнасці розных відаў маналагічнага маўлення (інфармацыйнае, пераканальнае, пабуджальнае і іншыя віды).

Віды дзейнасці: чытанне тэкстаў, вызначэнне іх стылю, тыпу, жанру; запіс прыказак, у якіх найбольш выразна выяўляецца сіла ветлівага слова, далікатных, паважлівых адносін да субяседнікаў; складанне плана тэксту, выступленне па плане; слуханне і аналіз, стварэнне прамоў.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

асноўныя правілы і сродкі арганізацыі эфектыўных маўленчых зносін; правілы маўленчага этыкету; структуру маналагічнага маўлення, стылістычныя асаблівасці і сродкі маўленчай выразнасці розных відаў маналагічнага маўлення.

Умець:

адрозніваць вуснае і пісьмовае, маналагічнае і дыялагічнае маўленне; абгрунтоўваць залежнасць структуры, стылістычных сродкаў і сродкаў

маўленчай выразнасці ад віду маналагічнага маўлення; ствараць тэксты розных відаў прамоў (інфармацыйнай, пераканальнай, пабуджальнай і іншых відаў) і выступаць з імі перад класам.

Валодаць:

правіламі і нормамі маўленчага этыкету ва ўласным вусным і пісьмовым маўленні.

## Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення (87 гадзін)

### Словазлучэнне (10 гадзін, з іх 4 гадзіны – на кантрольную і навучальную пісьмовыя работы)

Словазлучэнне; віды, спосабы і сродкі сінтаксічнай сувязі ў словазлучэнні. Свабодныя і несвабодныя словазлучэнні, іх сінтаксічная роля і стылістычныя магчымасці.

Сінтаксічныя нормы: асаблівасці дапасавання і кіравання ў беларускай мове. Граматычныя памылкі пры канструяванні словазлучэнняў розных тыпаў. Правілы ўжывання формы залежнага слова пры дапасаванні, кіраванні і прымыканні.

Сэнсава-стылістычная і тэкстаўтваральная роля словазлучэнняў у разгортванні тэмы, афармленні звязнага выказвання.

Сінаніміка словазлучэнняў, яе роля ў стварэнні тэкстаў рознай жанрава-стылістычнай прыналежнасці.

Навучальнае сачыненне-разважанне (эсэ аб праблеме чытання, ролі кнігі, бібліятэкі ў грамадстве).

Кантрольны падрабязны пераказ тэксту.

Віды дзейнасці: чытанне тэкстаў, сказаў, выпісванне словазлучэнняў, вызначэнне відаў, спосабаў і сродкаў сінтаксічнай сувязі ў словазлучэннях; вызначэнне свабодных і несвабодных словазлучэнняў, іх сінтаксічнай ролі і стылістычных магчымасцей; падрыхтоўка паведамлення на аснове тэарэтычнага матэрыялу і табліцы на тэму «Асаблівасці кіравання і дапасавання ў беларускай мове (у параўнанні з рускай)»; запіс спецыфічных беларускамоўных канструкцый да прапанаваных рускамоўных; запіс словазлучэнняў з выпраўленнем памылак у дапасаванні і кіраванні, тлумачэнне прычыны парушэння сінтаксічных норм; чытанне тэкстаў, выпісванне словазлучэнняў, што ілюструюць спецыфіку дапасавання і кіравання ў беларускай мове; паведамленне пра сутнасць дапасавання, кіравання і прымыкання, вызначэнне віду падпарадкавальнай сувязі ў словазлучэннях; чытанне тэкстаў, вызначэнне словазлучэнняў, што выяўляюць асаблівасці кіравання ў беларускай мове; пабудова схем

словазлучэнняў; вызначэнне сэнсава-стылістычнай і тэкстаўтваральнай ролі словазлучэнняў у разгортванні тэмы, афармленні звязнага выказвання; падбор сінанімічных словазлучэнняў; падрабязны пераказ тэксту; стварэнне тэксту-разважання.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

віды, спосабы і сродкі сінтаксічнай сувязі ў словазлучэнні; адрозненне свабодных і несвабодных словазлучэнняў, іх сінтаксічную ролю і стылістычныя магчымасці; асаблівасці дапасавання і кіравання ў беларускай мове; правілы ўжывання формы залежнага слова пры дапасаванні, кіраванні і прымыканні.

Умець:

выдзяляць словазлучэнні са сказаў, даваць словазлучэнням характарыстыку; правільна складаць словазлучэнні; вызначаць сэнсава-стылістычную і тэкстаўтваральную ролю словазлучэнняў у разгортванні тэмы, афармленні звязнага выказвання; выкарыстоўваць магчымасці сінанімікі словазлучэнняў; выяўляць і выпраўляць памылкі пры ўтварэнні словазлучэнняў; карыстацца даведнікамі па сінтаксісе беларускай мовы; рабіць падрабязны пераказ тэксту; ствараць тэкст-разважанне.

Валодаць:

сінтаксічнымі нормамі сучаснай беларускай мовы пры стварэнні ўласных тэкстаў розных тыпаў, стыляў і жанраў.

Просты сказ

(39 гадзін, з іх 7 гадзін – на кантрольныя і навучальныя пісьмовыя работы)

Сказ, асноўныя функцыі сказа. Парадак слоў у сказе. Стылістычныя магчымасці парадку слоў. Лагічны націск.

Галоўныя члены сказа. Спосабы выражэння дзейніка. Тыпы выказніка і спосабы яго выражэння. Стылістычныя магчымасці розных форм выражэння выказніка. Функцыі звязкі ў састаўным іменным выказніку.

Даданыя члены сказа. Віды дапаўнення, азначэння, акалічнасці. Сінтаксічная роля інфінітыва. Тэкстаўтваральныя функцыі даданых членаў сказа ў тэкстах-апісаннях, тэкстах-апавяданнях.

Аднасастаўныя сказы, іх віды і спосабы выражэння галоўнага члена ў іх. Размежаванне няпоўных і аднасастаўных сказаў. Сэнсава-стылістычная роля аднасастаўных сказаў у тэкстах розных тыпаў і стыляў маўлення.

Сказы з аднароднымі членамі, іх сэнсава-стылістычная і тэкстаўтваральная роля. Абагульняльныя словы пры аднародных членах сказа.

Сказы з адасобленымі членамі. Адасобленыя азначэнні і прыдаткі, акалічнасці, дапаўненні, удакладняльныя члены сказа, іх сэнсава-стылістычная і тэкстаўтваральная роля.

Сказы са зваротkамі, пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі. Сэнсава-стылістычная і тэкстаўтваральная роля сказаў са зваротkамі, пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі ў тэкстах розных тыпаў і стыляў маўлення.

Сказы з параўнальнымі зваротамі, іх сэнсава-стылістычная роля і тэкстаўтваральныя магчымасці.

Сінтаксічныя нормы: сувязь дзейніка і выказніка ў сказе; ужыванне аднародных і адасобленых членаў сказа; правілы ўжывання дзеепрыслоўных і дзеепрыметнікавых зваротаў.

Пунктуацыйныя нормы: працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам, знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі, адасобленымі членамі, зваротkамі, параўнальнымі зваротамі, пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі.

Навучальнае сачыненне-апавяданне пра паходжанне назвы свайго горада (вёскі, мясцовасці).

Навучальнае сачыненне-разважанне на маральна-этычную тэму.

Кантрольнае сачыненне-апісанне (пейзажная замалёўка) пра любімую пару года.

Кантрольная тэставая работа.

Віды дзейнасці: чытанне тэкстаў, сказаў, вызначэнне функцый сказаў, парадку слоў у сказах, стылістычных магчымасцей парадку слоў, лагічнага націску; вызначэнне галоўных членаў у сказах, спосабаў выражэння дзейніка, тыпаў выказніка, спосабаў яго выражэння, стылістычных магчымасцей розных форм выражэння выказніка, функцый звязкі ў састаўным іменным выказніку; паведамленне пра сувязь выказніка і дзейніка на аснове тэарэтычнага матэрыялу і табліцы; спісванне сказаў з выбарам адпаведных форм выказнікаў, тлумачэнне правіл сувязі выказніка і дзейніка; запіс сказаў з выпраўленнем памылак, выкліканых парушэннем правіл сувязі выказніка і дзейніка, тлумачэнне прычын парушэння сінтаксічных норм; тлумачэнне пастаноўкі знакаў прыпынку, каменціраванне пастаноўкі або непастаноўкі працяжніка паміж дзейнікам і выказнікам, запіс сказаў з пастаноўкай знакаў прыпынку; вызначэнне ў сказах (тэкстах) дадзеных членаў сказа, відаў дапаўнення, азначэння, акалічнасці, сінтаксічнай ролі інфінітыва, тэкстаўтваральнай функцыі дадзеных членаў сказа; вызначэнне відаў аднасастаўных сказаў, спосабаў выражэння галоўнага члена ў іх, вызначэнне няпоўных і аднасастаўных сказаў, стылістычнай ролі аднасастаўных сказаў у тэкстах розных тыпаў і стыляў маўлення; вызначэнне аднародных членаў у сказах, абагульняльных слоў пры аднародных членах, сэнсава-стылістычнай і тэкстаўтваральнай ролі сказаў з аднароднымі членамі; падрыхтоўка на аснове тэзісаў вуснага выказвання на тэму «Асаблівасці пабудовы сказаў з аднароднымі членамі»;

фармуляванне на аснове табліцы правіл утварэння дзеепрыслоўяў, падбор і запіс прыкладаў; фармуляванне на аснове тэксту правіл ужывання дзеепрыслоўных словазлучэнняў; чытанне тэкстаў, вызначэнне ў іх сказаў з аднароднымі членамі, адасобленымі членамі, звароткамі, пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі, параўнальнымі зваротамі; выяўленне ў сказах сінтаксічных памылак, запіс адрэдагаваных сказаў; паведамленне на аснове схем і тэарэтычнага матэрыялу пра пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі, адасобленымі членамі, звароткамі, пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі, параўнальнымі зваротамі; тлумачэнне пастаноўкі знакаў прыпынку ў простых сказах; пабудова схем сказаў; складанне і запіс сказаў па схемах; спісванне сказаў, тэкстаў (запіс пад дыктоўку сказаў, тэкстаў) з расстаноўкай знакаў прыпынку і іх тлумачэннем; каменціраванне пунктуацыйнага афармлення самастойна ўтвораных сказаў з аднароднымі членамі, адасобленымі членамі, звароткамі, пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі, параўнальнымі зваротамі; знаходжанне сінтаксічных і пунктуацыйных памылак у чужым і ўласным маўленні, запіс выпраўленых сказаў; праверка правільнасці ўтвораных сінтаксічных канструкцый і пунктуацыйнага афармлення простых сказаў з дапамогай даведнікаў па сінтаксісе і пунктуацыі беларускай мовы; стварэнне ўласных тэкстаў-апісанняў, тэкстаў-апавяданняў, тэкстаў-разважанняў; выкананне тэставай работы.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

асноўныя функцыі сказа; спосабы выражэння галоўных і даданых членаў сказа; сінтаксічныя прыметы і асаблівасці будовы простых сказаў розных тыпаў; правілы сувязі дзейніка і выказніка, пабудовы сказаў з аднароднымі членамі, адасобленымі членамі, са зваროткамі, пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі, параўнальнымі зваротамі, ужывання сказаў з дзеепрыслоўнымі і дзеепрыметнікавымі зваротамі; правілы пастаноўкі працяжніка паміж дзейнікам і выказнікам, знакаў прыпынку ў сказах з аднароднымі, адасобленымі членамі, звароткамі, параўнальнымі зваротамі, пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі.

Умець:

вызначаць сінтаксічныя прыметы і асаблівасці будовы простых сказаў розных тыпаў, іх сэнсава-стылістычную і тэкстаўтваральную ролю; захоўваць сінтаксічныя нормы сувязі дзейніка і выказніка, правілы пабудовы сказаў з аднароднымі членамі, адасобленымі членамі, са звароткамі, пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі, параўнальнымі зваротамі, ужывання сказаў з дзеепрыслоўнымі і дзеепрыметнікавымі зваротамі; захоўваць правілы пастаноўкі працяжніка паміж дзейнікам і

выказнікам, знакаў прыпынку ў сказах з аднароднымі, адасобленымі членамі, звароткамі, параўнальнымі зваротамі, пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі; карыстацца даведнікамі па сінтаксісе і пунктуацыі беларускай мовы; рабіць падрабязны пераказ тэксту; ствараць тэксты-апісанні, тэксты-апавяданні, тэксты-разважанні; выконваць тэставыя работы.

Валодаць:

сінтаксічнымі і пунктуацыйнымі нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы пры стварэнні ўласных тэкстаў розных тыпаў, стыляў і жанраў.

Складаны сказ. Чужая мова
(38 гадзін, з іх 7 гадзін – на кантрольныя і навучальныя пісьмовыя работы)

Складаназлучаныя сказы, асноўныя віды, будова. Сэнсава-стылістычная і тэкстаўтваральная роля складаназлучаных сказаў у тэкстах розных тыпаў і стыляў маўлення.

Складаназалежныя сказы, будова, сродкі сувязі, класіфікацыя. Складаназалежныя сказы з некалькімі даданымі часткамі. Сэнсава-стылістычная і тэкстаўтваральная роля складаназалежных сказаў у тэкстах розных тыпаў і стыляў маўлення.

Бяззлучнікавыя складаныя сказы, будова, сродкі сувязі. Сэнсава-стылістычная і тэкстаўтваральная роля бяззлучнікавых складаных сказаў у тэкстах розных тыпаў і стыляў маўлення.

Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак, будова, віды сувязі. Сэнсава-стылістычная і тэкстаўтваральная роля складаных сказаў з рознымі відамі сувязі частак у тэкстах розных тыпаў і стыляў маўлення.

Чужая мова, спосабы яе перадачы. Сінаніміка сказаў, якія перадаюць чужую мову, яе стылістычныя магчымасці. Сэнсава-стылістычная роля канструкцый з чужой мовай у тэкстах розных тыпаў і стыляў маўлення.

Цытаты, правілы іх афармлення.

Сінтаксічная сінаніміка.

Сінтаксічныя нормы: правілы ўжывання складаных сінтаксічных канструкцый у тэкстах розных тыпаў, стыляў і жанраў.

Пунктуацыйныя нормы: знакі прыпынку ў складаных сказах рознай будовы, канструкцыях з чужой мовай.

Навучальная тэставая работа.

Кантрольная тэставая работа.

Кантрольнае сачыненне-разважанне на грамадзянска-патрыятычную тэму.

Кантрольнае сачыненне-апавяданне пра наведванне цікавых мясцін, экскурсію ў музей, бібліятэку.

Кантрольны дыктант.

Віды дзейнасці: чытанне тэкстаў, вызначэнне ў іх складаных сказаў, іх тыпаў (складаназлучаных, складаназалежных, бяззлучнікавых складаных сказаў, складаных сказаў з рознымі відамі сувязі частак); канструкцый з чужой мовай; вызначэнне сэнсавых адносін паміж часткамі складаных сказаў; чытанне няправільна пабудаваных складаных сказаў; вызначэнне сінтаксічных памылак, запіс адрэдагаваных сказаў; паведамленне на аснове схем і тэарэтычнага матэрыялу пра пастаноўку знакаў прыпынку ў складаназлучаных, складаназалежных, бяззлучнікавых складаных сказах, складаных сказах з рознымі відамі сувязі частак; канструкцыях з чужой мовай; тлумачэнне пастаноўкі знакаў прыпынку ў складаных сказах; пабудова схем сказаў; складанне і запіс сказаў па схемах; перабудова простых сказаў у складаныя, складаных у простыя, спісванне сказаў, тэкстаў (запіс пад дыктоўку сказаў, тэкстаў) з расстаноўкай знакаў прыпынку і іх тлумачэннем; каменціраванне пунктуацыйнага афармлення самастойна ўтвораных складаназлучаных, складаназалежных, бяззлучнікавых складаных сказаў, складаных сказаў з рознымі відамі сувязі частак; канструкцый з чужой мовай; знаходжанне сінтаксічных і пунктуацыйных памылак у чужым і ўласным маўленні, запіс выпраўленых сказаў; праверка правільнасці ўтвораных сінтаксічных канструкцый і пунктуацыйнага афармлення складаных сказаў, канструкцый з чужой мовай з дапамогай даведнікаў па сінтаксісе і пунктуацыі беларускай мовы; стварэнне ўласных тэкстаў-апавяданняў, тэкстаў-разважанняў; выкананне тэставых работ.

## Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

сінтаксічныя прыметы і асаблівасці будовы складаных сказаў розных тыпаў, іх сэнсава-стылістычную і тэкстаўтваральную ролю; правілы ўжывання складаных сінтаксічных канструкцый у тэкстах розных тыпаў, стыляў і жанраў; правілы пастаноўкі знакаў прыпынку ў складаназлучаных, складаназалежных, бяззлучнікавых складаных сказах, складаных сказах з рознымі відамі сувязі частак; спосабы перадачы і пунктуацыйнага афармлення чужой мовы.

Умець:

вызначаць сінтаксічныя прыметы і асаблівасці будовы складаных сказаў розных тыпаў, сказаў, якія перадаюць чужую мову; вызначаць іх сэнсава-стылістычную і тэкстаўтваральную ролю; правільна складаць і пунктуацыйна афармляць складаныя сказы рознай будовы; канструкцыі з чужой мовай; карыстацца сінтаксічнымі сінонімамі; знаходзіць і выпраўляць маўленчыя недахопы і парушэнні норм літаратурнай мовы ў

чужым і ўласным маўленні, устанаўліваць прычыны парушэння норм; карыстацца даведнікамі па сінтаксісе і пунктуацыі беларускай мовы; рабіць падрабязны пераказ тэксту; ствараць тэксты-апавяданні, тэксты-разважанні; запісваць тэксты пад дыктоўку з захаваннем норм сучаснай беларускай літаратурнай мовы; выконваць тэставыя работы.

Валодаць:

сінтаксічнымі і пунктуацыйнымі нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы пры стварэнні ўласных тэкстаў розных тыпаў, стыляў і жанраў.

### Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага
### (3 гадзіны)

Маўленчыя зносіны і маўленчы этыкет. Нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы; памылкі, выкліканыя іх парушэннем.

Віды дзейнасці: чытанне вершаў з захаваннем арфаэпічных норм; чытанне і запіс сказаў (тэкстаў) у адпаведнасці з арфаграфічнымі і пунктуацыйнымі нормамі; утварэнне і запіс словазлучэнняў у адпаведнасці з сінтаксічнымі нормамі; чытанне сказаў з памылкамі, тлумачэнне прычын памылак, запіс выпраўленых варыянтаў; запіс сказаў з расстаноўкай знакаў прыпынку, устаўленнем прапушчаных літар; тлумачэнне напісання слоў, пастаноўкі знакаў прыпынку ў сказах; чытанне тэкстаў, вызначэнне іх стылю, тыпу; выпісванне сказаў рознай будовы, вызначэнне іх ролі ў тэкстах; пераклад тэкстаў з рускай мовы на беларускую; падрыхтоўка тэкстаў розных відаў прамоў, паведамленняў на лінгвістычную тэму; фармуляванне і выкананне заданняў, скіраваных на паўтарэнне лексікі, фразеалогіі, складу слова, словаўтварэння, марфалогіі і сінтаксісу.

### Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы; стылістычныя асаблівасці і сродкі маўленчай выразнасці розных відаў маналагічнага маўлення; нормы маўленчых паводзін.

Умець:

аналізаваць прачытаныя і праслуханыя тэксты; выпраўляць памылкі ў чужым і ўласным маўленні; запісваць сказы, тэксты ў адпаведнасці з моўнымі нормамі; ужываць моўныя сродкі з улікам культуры маўлення; захоўваць нормы маўленчых паводзін; ствараць тэксты розных відаў прамоў; уласныя вусныя і пісьмовыя выказванні розных тыпаў, стыляў і жанраў.

Валодаць:

нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы пры стварэнні ўласных вусных і пісьмовых выказванняў; нормамі маўленчых паводзін.